Цана асобнага нумару 20 гр. **Pierasyłka apłačana ryčałtam**

№ 31 (530). Вільня, Пятніца 22 Верасьня 1933 г. Год IX (XVII)

Беларуская КРЫНІЦА

Палітычная, Грамадзкая і Літэратурная Газэта.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: ВІЛЬНЯ, Завальная вул. 1-1. (Wilno, ul. Zawalna 1-1).
Рэдакцыя адчынена ад 9 гадз. ран. да 4 гадз. веч.

Цэны абвестак паводле ўмовы.

„Бел. КРЫНІЦА" каштуе на год—4 зл., на паўгода — 2 зл., на 3 месяцы — 1 зл.. Заграніцу ўдвая даражэй.
ГАЗЭТА ВЫХОДЗІЦЬ РАЗ У ТЫДЗЕНЬ.

Канфіската „БЕЛАРУСКАЙ КРЫНІЦЫ" №30.

15-га верасьня с. г. па загаду Віленскага Гарадзкога Старасты № 30 з дн. 15.IX.1933 „Беларускай Крыніцы" сканфіскаваны за артыкул „Палітычны гандаль беларусамі" (З прычыны абмену Б. Тарашкевіча і Ф. Аляхновіча), пры чым быў так-жа апячатаваны ўвесь набор таго-ж нумару. Пячацьці з набору зьняты па загаду таго-ж Старасты 22.IX.33. Дзеля гэнай прычыны гэты № 31 нашай часопісі, без сканфіскаванага артыкулу, выходзіць спазьніўшыся.

Змурок социялізму.

Социялісты і камуністы (бальшавікі) прапаведваюць, што народы знайдуць свабоду аж тады, калі ва ўсім сьвеце запануе социялізм г. зн. у аднэй сусьветнай социялістычнай дзяржаве. Дзеля гэтага социялісты выкінулі кліч „работнікі ўсіх краеў аб'ednывайцеся!"

Ідучы да гэтай мэты социялісты стараюцца зьнішчыць нацыянальныя дзяржавы, а бацькаўшчыну ўважаюць за буржуазную выдумку, бо цьвердзяць, што работнікі ня знаюць сваей бацькаўшчыны і іх бацькаўшчына — ўвесь сьвет. Социялісты зрываюць лучнасьць з народнай традыцыяй, не прызнаюць нацыянальнай лучнасьці і стараюцца заглушыць народнае пачуцьцё — патрыятызм. Рэлігію ўважаюць за духовую атруту. Гэткі матэрыялістычны социялізм заснаваў К. Маркс, па паходжаньню — жыд. З самага пачатку быў заснаваўшыся першы социялістычны інтэрнацыянал, які не ўдалося тварцом яго ажывіць і ён разваліўся: на мейсца аднаго сусьветнага социялістычнага інтэрнацыяналу паўсталі два — II социялістычны і III камуністычны. Прад сусьветнай вайной социялісты мелі ў эўропэйскіх дзяржавах даволі вялікую сілу, дык спадзяваліся, што не дапусьцяць да вайны забастоўкамі работнікаў ва ўсіх дзяржавах і гэтак завядуць свой лад на сьвеце. Аднак гэтага ня было.

Сусьветная вайна паказала, што і работнікам даражэйшая свая бацькаўшчына і свой народ ды свая дзяржава за сусьветную інтэрнацыянальную работніцкую еднасьць. Работнікі ва ўсіх дзяржавах без забастовак і бунтаў пашлі: адны ў войска, а другія — ўваружаць армію і гэтак баранілі свае народныя дзяржавы. Сапраўднасьць паказала, што нямецкаму работніку бліжэйшы нямецкі селянін, інтэлігент, а нават прамысловец за французкага, ангельскага, расейскага і іншых дзяржаў работніка. Гэта самае пацьвярджаюць факты і з другога боку ваюючых тады дзяржаў.

Па вайне ў розных дзяржавах социялісты здабылі ўладу. Царскую Расею ператварылі бальшавікі на камуністычную дзяржаву. У Англіі, Францыі і ў Нямеччыне социялісты ўзялі ўладу ў свае рукі. Ды нядоўга цешыліся социялісты гэтай здабычай. Социялістычныя ўрады не маглі даць рады з гаспадарчым крызысам і выявілі гэтым няжыцьцёвасьць социялістычнай тэорыі.

Пасьля гэткай спробы социялістычнага жыцьця пачаў расьці нацыяналізм, які ва ўсім сьвеце шырока разрастаецца. Італьянскі нацыяналізм разьбіў у пух і прах італьянскіх социялістаў. У Нямеччыне запанаваў так-жа нацыяналізм у форме гітлерызму. У Францыі, Польшчы і іншых краёх расьце таксама нацыянальная стыхія, выпіхаючы збанкрутаваны социялізм.

Банкрутуе социялізм і ў камуністычнай дзяржаве — ССРР. У камуністычнай дзяржаве безпашчадна душаць бальшавікі беларусаў, украінцаў, грузінаў, армянаў і іншыя народы. Камуністычная дзяржава паказала, што яна ёсьць такой-жа турмой для іншых народаў, якой была дзяржава маскоўскага царызму. Апрача гэтага бальшавікі выявілі поўную нядольнасьць камуністычнага социялізму дзеля заспакаеньня неабходных для жыцьця патрэб насельніцтва. Аб гэтым пацьвярджае і сучасны голад у ССРР.

Апошні зьезд II социялістычнага інтэрнацыяналу, які адбыўся 21—25 жніўня с. г. у Парыжы, выявіў поўнае банкруцтва социялістычнай ідэі. Ва ўсім сьвеце работнікі, а нават і павадыры пакідаюць социялістычныя партыі. У Польшчы пакінуў социялістычную партыю П.П.С. Язэп Пілсудзкі і ўзяўся за будову нацыянальнай дзяржавы, у Італіі Мусоліні выракся социялізму (да вайны быў заядлы социяліст) і стаўся дыктатарам італьянскага нацыяналізму. Апошнімі часамі нямецкія работнікі масава пакідаюць социялістычную і камуністычную партыю ды пераходзяць да Гітлера пад сьцяг нямецкага нацыяналізму.

Збанкрутавалі социялісты, асабліва камуністы, і ў нас, у Зах. Беларусі. Апошнімі часамі, калі савецка-польская ўгода пачала пашырацца ды пачалося бальшавіцка-польскае братаньне, беларускія ўра-радыкалы ня ведаюць на каторую нагу стануць, каб хоць крыху прыляпіцца да народу. Гэтак доўга быць ня можа. Нашы дасюлешнія социялісты-радыкалы мусяць рашыцца на нешта адно: ці стануць па старане бальшавіцка-польскага братаньня і замацоўваньня ў Усх. Беларусі расейскага-бальшавіцкага рэжыму, а ў Зах. Беларусі — сучаснага палажэньня на заўсёды, ці перайсьці пад бел-чырвона-белы сьцяг і стануць барацьбітамі за беларускія народныя ідэалы.

Сацыялісты гавораць няпраўду, калі кажуць, што нацыянальныя партыі ня хочуць, каб сялянам і работнікам лепш жылося, каб іх ня вызысківалі капіталісты. Прыкладам, Беларуская Хрысьціянская Дэмокрацыя ў сваей праграме і сваей дзейнасьцяй дамагаецца вялікай социяльнай рэформы на карысьць пераважна сялян, а так-жа і на карысьць работнікаў.

п.

Бацькі Беларусы, вучыце дзетак сваіх роднае беларускае граматы!

Новы коопэратыўны закон ужо блізка!

Год з лішнім, як праскочыла праз газэты першая вестка аб задуманай зьмене польскага коопэратыўнага закону. Апошнімі днямі гэта вестка набрала ўжо выгляду зусім выразнага. Ягулам новы закон вельмі звужае і абмяжоўвуе найістотнейшую адзнаку коопэрацыі — самадзейнасьць. Гэта абмяжоўваньне трапляе кожную коопэратыўную пляцоўку прад ейным яшчэ заснаваньнем і праследуе аж да самага "скананьня."

Калі прад гэтым суд зацьвярджаў, а нават мусіў зацьвердзіць статут кожнае новае коопэратывы, абы толькі гэты статут ня меў фармальных недахопаў, то паводле новага закону гэты-ж суд ня будзе мець права зацьвердзіць гэткі новы статут датуль, пакуль на гэта не пазволіць старшыня г. зв. Коопэратыўнай Рады; а гэты старшыня ня ёсьць асобай з выбару, але звычайным урадаўцам міністэрства скарбу.

Заснуваньне новых коопэратыўных саюзаў (саюзу коопэратываў), а асабліва здабыцьцё імі права рэвізіі будзе вельмі трудным, бо і тут рашае нават не старшыня Коопэратыўнай Рады, а сам міністар фінансаў. Не пакінены спакойна і коопэратыўныя саюзы ўжо існуючыя: яны ў працягу пару месяцаў пасьля управамоцненьня новага закону будуць змушаны нанова здабыць права да выконваньня сваіх дагэтуляшніх абавязкаў, так як-бы гэтых правоў дагэтуль зусім ня мелі. Мала таго: цяпер міністр можа агранічыць права аднаго коопэратыўнага саюзу на карысьць другога, можа загадаць такому саюзу лучыцца у сабе толькі коопэратывы пэўнага віду, напр. — вытворчыя, адбіраючы ад яго коопэратывы крэдытовыя, спажывецкія ці наадварот; можа расшырыць або аграніччыць дзейнасьць Коопэратыўнага Саюзу да нейкай толькі тэрыторыі, напр. ваяводзтва, забараняючы працаваць на абшары дальшым. Нават унутранае жыцьцё такіх саюзаў рэгулюецца ўрадавым надзорам: бюджэт прыняты агульнымі сходамі рэвізыйных саюзаў важны толькі тады, калі яго зацьвердзіць той-жа старшыня Коопэратыўнай Рады і г. д.

Словам, новы коопэратыўны закон хоча налажыць цяжкі надзор над дзейнасьцю коопэрацыі ад самых нізоў і да самых вярхоў. Значэньне гэткага надзору нават пры ідэальным выконваньні яго з боку адміністрацыйных уладаў, будзе заўсёды вельмі абцяжваючым тормазам. У практыцы-ж цяжар гэты акажыцца бадай яшчэ большым.

Для поўнасьці трэба зазначыць і аб такіх зьменах у новым законе, як абавязак статутовае рэвізіі найменш раз на год, копія пратаколу агульнага сходу коопэратывы мусіць быць выслана ў Рэвізыйны Саюз найпазьней цераз месяц; інформацыі аб тым, хто колькі мае грашэй паложаных у коопэратыўнай касе, можна даваць толькі на афіцыяльнае жаданьне суду...

Ягулам новы закон вельмі абмяжоўвуе коопэрацыю. Ня ёсьць гэта адарваны выпадак у сусьветным гаспадарчым жыцьці, але адным з шмат ягоных праяваў. Міма ўсё гэта аднак коопэрацыя развіваецца, бо яна быццам чэрпае сілу з перамаганьняў усякіх перашкодаў. І нам беларусам пад Польшчай трэба выкарыстаць асабліва астатак часу важнасьці дагэтуляшняга „старога" коопэратыўнага закону, ды ўсьведаміўшы сваіх суседзяў чым хутчэй склікаць арганізацыйныя сходы, зацьвярджаць статуты і падаваць іх да рэестру ў суды. Цяпер яшчэ час засноўваць коопэратывы ўсюды, дзе гэтага хочаць самі закладчыкі, а за месяц можна будзе заснаваць такую-ж коопэратыву толькі там, дзе на гэта пазволіць чыноўнік польскага міністэрства скарбу.

Дык усе, хто жыў, на коопэратыўны фронт! —іч.

P. S. Па дальшыя інформацыі зьвяртайцеся ў рэдакцыю „Самапомач": Вільня, Полацкая вул. 4—10.

З газэт.

Найстрашнейшы плян расейскіх камуністаў

Лёндэнская газэта „Таймс" падае вестку з Саветаў такога зьместу: Камуністычная ўлада ў Маскве апрацоўвае цяпер новы колёнізацыйны плян. Гэты плян мае на мэце разьмясьціць «непакорныя элементы» і нацыянальныя меншасьці ў розныя куткі С.С.Р.Р.

Гэткі плян быў ужо праведзены ў паўночным Каўказе на спробу. Ядтуль вывезена мяйсцовае насельніцтва ў Сібір і на далёкую поўнач, а на іх мейсца прывезены людзі з другіх краеў С.С.Р.Р. Незважаючы, што новыя пасяленцы ў новых варунках праявілі непрадуктыўнасьць працы і дзеля гэтага панізіўся там ураджай, аднак камуністычная ўлада прызнала гэтыя спробы за карысныя пад паглядам палітычным. Дзеля гэтага, цяпер камуністы маюць праводзіць гэты плян у шырокім размеры. Што абазначае гэты плян, хіба тлумачыць ня трэба. Калі-б бальшавікі надоўга ўкрапіліся і паапякаваліся даўжэйшы час Усходняй Беларусяй, дык на мейсца беларусаў, як „непакорнага элемэнту", могуць навезьці маскалёў або дзікіх пакорных кіргізаў, а беларусаў разьмясьціць па ўсіх кутках С.С.Р.Р. Дык вось які „беларускі дом" хочуць будаваць камуністы для беларусаў у Усходняй Беларусі.

Мільёнамі людзі мруць з голаду.

Карэспандэнт амэрыканскай газэты „Нью Ёрк Таймс" Дюранті, які заўсяды бароніць камуністычную ўладу, 23 жніўня с. г. піша ў сваей газэце з Масквы аб голадзе ў СССР гэтак:

Хоць весткі аб голадзе на паўдні Расеі і пабольшаны, аднак у гэтым шмат праўды. Людзі там недаядаюць, а дзеля гэтага на Ўкраіне і на Каўказе памор даходзіць да мільёнаў людзей у год, цяпер памерла 3—4 мільёны людзей ад голаду.

Аб нямецкай палітыцы над Балтыцкім морам.

Жыдоўскія газэты рыская „Унзэр Стімэ" і ковенская „Пэгдэй Врігле" пішуць, што між Нямеччынай і Літвой вядуцца гандлёвыя перагаворы, на якіх гаворыцца аб далейшых плянах Розэмбэрга. Паводле гэтых плянаў, пішуць жыдоўскія газэты, прадбачыцца ўтварэньне надбалтыцкай фэдэрацыі. У фэдэрацыю гэту маюць увайсьці: Нямеччына, Літва з Клайпэдай ды Віленшчынай, Эстонія, Латвія і Беларусь. Фэдэрацыйная гэта дзяржава будзе мець дзьве ўрадавыя мовы: нямецкую і літоўскую, а ўсе іншыя: беларуская, польская, эстонская і латышская будуць мовамі тэрыторыяльнымі і будуць мець застасаваньне ў пэўных галінах дзяржаўнага жыцьця.

Словам, людзі ломяць галовы праектамі шукаючы выхаду з сучаснага палажэньня.

З беларускага жыцьця.

Беларускі дэлегат на Кангрэс Нацыянальных Меншасьцяў. 13 верасьня с. г. з Вільні выехаў, дэлегаваны Беларускім Нацыянальным Камітэтам, інж. Ядольф Клімовіч на Міжнародны Кангрэс Нацыянальных Меншасьцяў, які адбудзецца ў Бэрне (Швайцарыя) 16—18 верасьня с. г.

З дзейнасьці Б. Х. Д. (Беларускай Хрысьціянскай Дэмократыі). У суботу дня 9-га верасьня адбылося паседжаньне Прэзыдыуму Ц.К.—Б.Х.Д. Паміж іншымі справамі разглядалася сучасная палітычная сытуацыя беларускага народу. Сьцьверджана пры гэтым, што сучасны курс польска-бальшавіцкай угоды вельмі шкодны для найжыцьцёвейшых інтарэсаў беларускага народу. Найлепшай апорай самадзейнасьці і палітычнай лініі беларускага народу ёсьць наша нацыянальная культура і гаспадарчая сіла. Дзеля гэтага Прэзыдыум Ц.К.—Б.Х.Д. будзе сам успамагаць усякія пачынаньні дзеля падняцьця ў беларускім народзе ровеня собскай культуры і гаспадарчай сілы, а так-жа заклікае да гэткай працы ўсіх сваіх сяброў і прыхільнікаў.

У рэлігійным жыцьці пастаноўлена і далей падтрымліваць праводжаную ўжо лінію беларусізацыі, пачатае паразумеваньне праваслаўных дзеячоў беларускіх і ўкраінскіх — і на далей разьвіваць. — Дзеля ўсыстэматызаваньня арганізаванай працы на мясцох склікаецца ў блізкім часе Рада Б.Х.Д.

Арганізацыйны Сход закладчыкаў беларускай спажывецкай коопэратывы ў Вільні склікаецца ў нядзелю дня 17 г. м. на гадз. 16-ую (4-ую па абедзе) у памешканьні Беларускага Інстытуту Гаспадаркі і Культуры (Завальная 1—1).

З выдавецкае нівы. 15-га верасьня с. г. пасьля летняга перарыву вышаў з друку чарговы № 7 (88) беларускай рэлігійнай каталіцкай часопісі «Chryścijanskaja Dumka». Зьмест часопісі багаты.

N. N.

Мужыцкая арытмэтыка.

(Абразок з царскіх часоў).

Ці няма ў вас, пане Сымоне, якойнебудзь газэты ці кніжкі? — пытаў хурман Янтон манапольшчыка, завязваючы ў хусьцінку грошы за хурманку.

Сымон Лісоўскі, панок сярэдняга веку, чырванатвары, з круглым чэравам, пацягнуў цыгарку і выпусьціў хмару дыму.

— Я на што табе кніжка? — трохі памаўчаўшы, спытаўся ён, насупіўшы рэдкія бровы.

— Пабавіўся-бы сьвятам, а то запамятаваў, калі й кніжка была ў хаці, — адказвае Янтон,—быць можа ўжо й абецадла забыўся.

— Дык табе ад гэтага вялікая бяда?... Папраўдзе, пустая справа — чытаць кніжкі— пачаў гаварыць Лісоўскі. Гэта-ж і ня йдзе мужыку.

— Праўда ваша, ці-ж патрэбна, каб нашы галовы былі заняты кніжкамі, — згаджаецца Янтон, — часам за работаю няма калі зірнуць і ўгору, ня то што ў кніжку!...

— Я ці не знайшлося-б дзеля мяне чаго-небудзь, ізноў пытаецца Янтон, хвілінку пераждаўшы, — пачытаў-бы папалудні, каб не бадзяцца так.

— Хіба вось што, — падумаўшы сказаў манапольшчык, — я вынясу табе псалтыр. Дзеля сьвята лепшай кніжкі й не знайсьці.

— Псальтыр ёсьць у мяне, паночку, — прагукнуў Янтон. — Ці няма ў вас якой іншай?... Можа ёсьць такая, што піша пра Думу, ці пра зямлю?

Пан Лісоўскі, вытарашчыўшы вочы, пакасіўся ў бок і зашчаміў губу.

— Такіх кніжак, як ты кажаш, у мяне, братка, ня водзіцца. Ты ведаеш, куды цяпер хаваюць за гэткія кніжкі? — Лісоўскі срога зірнуў на Янтона. — Сьцеражыся, Янтоне, тых кніжак як агню — па прыяцельску раджу табе. Я калі ўжо табе такая ахвота чытаць, дык пачакай—я табе дам іншую кніжку.

Пан Сымон вышаў у другі пакой, адчыніў шафу і пачаў капацца ў горбачцы нейкіх папераў і кніжак. Выцягнуўшы з-пад споду старэнькі, у абшарпанай вокладцы, задачнік Еўтушэўскага, ён абмахнуў пыл з яго і вынес Янтону.

— Вось табе, Янтоне, кніжка, сказаў Лісоўскі, аддаючы яму задачнік. — Ня пустая якая-небудзь — карысная кніжка. Тут кожная задача — як бы загадка: пакруціш галаву, пакуль дойдзеш толку.

— Дзякуй вам, пане Сымоне, — сказаў Янтон і ўзяўшы, не разглядаючы, кніжку пад руку развітаўся дый пайшоў з хаты. Лісоўскі, стоячы каля вушака, доўга яшчэ ўзіраўся яму ўсьлед. Потым ціхенька захіхікаўшы і, тыкаючы пальцам у дзьвery, працадзіў скрозь зубы: „вось табе кніжка, хаме! Чытай, гад, чытай! Там будзе табе і пра зямлю і пра Думу."

Вясёлы і рады, пасьмейваючыся, пайшоў ён у другі пакой палунднаваць.

Ядпачыўшы па палудні, манапольшчык узяў кіёчак і пайшоў на прахожку. Ідзе ён сялом, на кіёчак апіраецца. Пад хатамі, каля прысадзьдзя, на горбах бярвеньня, што ў мінуўшым годзе пашчасьціла прыцягнуць з казённага дый панскага лесу, сядзяць мужчыны, бабы, гутараць між сабою; шоўгаюцца, ня маючы нідзе сабе мейсца, недаросткі і дзе-ня-дзе чутна, як праўвецца песьня. У сяле няма „паноў," апрача п. Сымона Лісоўскага і ён, дзеля гэтага, адчувае тут сябе маленькім князьком. Людзі нізенька кланяюцца яму і ён прывітліваківае ім галавою. Яму-ж вельмі прыемна бачыць паваньне да сваей асобы.

З жыцьця Літоўцаў.

Адкрыцьцё Літоўскай Клінікі. Саюз лекараў, утрымліваючы Літоўскую Клініку, купіў у Вільні пры вул. Міцкевіча 33-А прыгожы дом, перарабіў яго дапасоўваючы да патрэб лекарні і перанёс туды з дому пры вул. Віленскай Клініку.

У нядзелю 10 г. м. адбылося ўрачыстае пасьвячэньне гэтай Клінікі. Высьвячаў Літоўскую Клініку арцыб. Ялбжыкоўскі. На ўрачыстасьць гэтага палацу здароўя зышлося многа народу: прадстаўнікоў літоўскага, беларускага, жыдоўскага і польскага грамадзянства.

Трэба зазначыць, што Літоўская Клініка цяпер зьяўляецца найпаважнейшай у Вільні лячніцай; мае ўсе аддзелы, электрычнае прасьвятленьне і нават заводзіцца гідротэрапія—лячэньне вадой.

Літоўская Клініка цяпер устроена паводле вымогаў патрэб апошняй тэхнікі і зьяўляецца сапраўдным палацам здароўя.

З Польшчы.

Нямецкія ўплывы на Горным Шлёнску. Польская прэса піша, што на Горным Шлёнску вялікі лік польскіх дзяцей бацькі перавялі ў нямецкія школы. Арганізацыйнае жыцьцё да таго аслабла, што людзі ня ўмеючы нават гаварыць панямецку пішуцца ў нямецкія арганізацыі, каб толькі мець нямецкі білет. Поруч з гэтым расьце ненавісьць да ўсяго польскага і польскай дзяржаўнасьці. Чытаем далей у гэтай прэсе, што нямецкая прапаганда гадуе людзей на здраду Польшчы.

Колькі чаго прывезена з заграніцы ў Польшчу. Галоўны Статыстычны Урад падае, што ад 1 жніўня 1932 г. да 31 ліпня 1933 г. прывезена з заграніцы ў Польшчу: пшаніцы 218 тысяч мэтр. цэнтнараў, жыта 98 тысяч мэтр. цэнт., варыва і ярыны 47 тысяч мэтр. цэнт., насеньня 16 тысяч мэтр. цэнт., тэхнічнага насеньня 660 мэтр. цэнт., лёну і канапель 8 тысяч мэтр. цэнт., тлушчаў 174 тысячы мэтр. цэнт., сырых скураў 187 тысяч мэтр. цэнт., воўны 162 тысячы м. ц., алею 18 тысяч м. ц. Гэта прадукты земляробскія, якіх у Польшчы ёсьць даволі і якія можна замяніць краёвымі: Дык і нічога дзіўнага, што нашае збожжа і валакно таннае на нашых рынках, бо-ж трэба ўпатрэбіць, ды і не апошнімі, гэтыя прадукты прывезены з заграніцы.

Ліквідацыя ўнівэрсытэцкіх катэдраў. Паводле загаду Міністэрства Асьветы мае быць ва ўсіх польскіх унівэрсытэтах зачынена аж 60 унівэрсытэцкіх катэдраў.

Выбары ў самаўрады. Новы самаўрадавы закон увайшоў у сілу. Паводле гэтага закону маюць адбыцца выбары ў самаўрады сёлета ў восень і на вясну.

Нутраная пазыка. Урад выдаў закон аб нутранай пазычцы на 120 мільёнаў зл. Газэты пішуць, што ўрад хоча гэтай пазыкай латаць дзюры дзяржаўнага бюджэту.

Дарагая дэлегацыя. У м-цы ліпні адбылася ў Лёндане сусьветная гаспадарчая конфэрэнцыя, якая кончылася нічым. На гэту конфэрэнцыю езьдзіла дэлегацыя і з Польшчы, якая каштавала польскаму скарбу 150 тысяч зл.

Надзвычайны — даразны суд над сялянамі. У Кобрыне (на Палесьсі) адбыўся даразны суд над 9 сялянамі, каторых абвінавачвалі ў імкненьні да адарваньня ўсходніх земляў польскай дзяржавы. Імкненьне гэтае выявілася 4 жніўня ў Навасёлках у забурэньні сялян проціўпаліцыі. Дня 7 г. м. суд засудзіў 8 сялян назаўсёды ў турму, а жанчыну Каплан перадаў звычайнаму суду.

Бальшавіцкая конніца ў Польшчы. Газэты падаюць, што ў Польшчу мае прыехаць у госьці цэлы швадрон бальшавіцкай конніцы. Словам, дружба і гасьціннасьць.

З заграніцы.

Польска-румынска-савецкія перагаворы. Бэрлінскі караспандэнт газэты „ДэйліЭкспрэсу“ падае сэнсацыйную вестку аб перагаворах між Польшчай, Румыніяй і Саветамі. Берлінскія палітычныя кругі гадаюць, што перагаворы гэтыя адбудуцца з мэтай проціўстаўленьня Нямеччыне.

Францыя адгароджваецца ад Нямеччыны. Францыя пасьпешна і нязвычайна сільна ўкрапляецца ўдоўж нямецкай граніцы. Нядаўна гэныя ўкрапленьні агледаў сам прэзыдэнт Францыі. Газэты пішуць, што ня шмат відаць гэтага ўкрапленьня на паверху зямлі, а цягнецца яно сотні кілёмэтраў у водступе 12—18 кілм. ад граніцы. Пад зямлёй там пабудаваны цэлыя гарады, у якіх вялікія арміі могуць жыць у глыбіні пад зямлёй доўгія месяцы. Пад зямлёй ходзяць цягнікі. Прыгатавана мейсца для вялізарных гармат і ўстроена прыладзьдзе затапленьня вадой вялікага абшару зямлі ў працягу некалькіх гадзін. Словам, крэпасьць паводле апошняй тэхнікі.

Таёмная перагрупіроўка войска ў Італіі. З Рыму падаюць газэты, што ў Італіі адбываецца таёмная перагрупіроўка войска ў окрузе Брэнеру. Газэты цьвердзяць, што гэта перагрупіроўка адбываецца ў зьвязку з аўстрыйска-нямецкім конфліктам.

Словам, на захадзе Эўропы вялікае напружаньне, ад якога нясе смурод пораху.

Бальшавіцка-фашыстоўскі саюз. Нядаўна між ССРР і Італіяй заключаны дагавор аб ненападаньні, які забясьпячае бальшавікоў ад фашыстаў, а фашыстаў ад бальшавікоў. Словам, бальшавікі з фашыстамі даходзяць да ладу абы толькі трымацца на ўзьверху і панаваць.

Аддавай мяса камуністам. У Маскве Савет «Народных» Камісараў і Ц. К. Камуністычнай партыі выдалі дэкрэт аб прымусовым аддаваньні мяса камуністычнай дзяржаве ў 1934 г. У гэтым дэкрэце сказана, колькі якая гаспадарка і ў які тэрміне мусіць даць кам. дзяржаве мяса. Хто ня выканае гэтага загаду, будуць забіраць мяса сілай ды яшчэ штрафаваць. Мяса мусяць аддаваць сьвежае— найлепш жывёлу ня выключаючы і курэй. Сьвініну аднак трэба аддаваць добра законсэрваваную.Відаць тарарышчы хочуць мець і сьвежай курацінкі і засіверaных кумпячкоў. Але ці заспакоіць іх апэтыт згалены і зьнішчаны селянін, які сам з дзяцьмі пухне ад голаду?

Рэвалюцыя на Кубе прадаўжаецца. Пасьля кароткага ўспакаеньня пачалася на Кубе ўзноў рэвалюцыйныя заварушэньні. Цяпер там імкнуцца захапіць уладу камуністы.

Дробныя весткі.

Пагода. Астралегі вяшчуюць, што ў гэтым месяцы будзе пагода гэткая: Прад 20 дождж, бурна, зімна. Па 20 крыху распагодзіцца, але каля 24 трэба спадзявацца ўзноў дажджоў. Пасьля 25 пагода. Халодныя ночы, можа нават прымаразкі.

Хто будзе плаціць „маёнткoвую“ даніну. Сяляне, што плацяць менш, як 25 зл. грунтовага падатку, ня плацяць даніны цалком. Сяляне, што плацяць 25 да 50 зл. грунтовага падатку, даплачваюць адну чацьвертую часьць (Прыкл. 15 зл. ад 60 зл. падатку). Хто плаціць больш як 60 зл. грунт. падатку, плаціць 44 проц. гэтага падатку.

Два новыя падаткі. Улада прыгатаўляе яшчэ два новыя падаткі: 10-ціпроцантовы дадатак да грунтовага падатку і падатак разьніцкі. Ад першага падатку маюць зволніць малазямельных гаспадароў і нават багацейшых сялян у ўсходніх ваяводзтвах. Разьніцкі падатак будзе гэткі: ад рагатай скаціны па 3 зл. ад штукі, ад цялят па 50 гр., ад сьвіней 1.50 гр. Ад убою для сябе падатку ня будзе.

Польскае жыта таннае. На найбліжэйшым эўрапэйскім рынку ў галяндскім Амстэреаме плацяць за цэнтнар польскага жыта 8 зл. 65 гр. Адлічыўшы кошт перавозу, цана будзе 4 зл. За гэткую цану, а то і таней мусіць наш селянін прадаваць жыта.

Затопа ў Кітаю. У вокрузе Шандун разьліўшыся вада затапіла 5 тысяч вёсак. Сотні тысяч людзей уцякае з загрожанай затокай мясьціны.

Армія палітычных вязьняў. Соцыялістычныя газэты падаюць, што ў Нямеччыне сядзіць у турмах 80 тысяч палітычных вязьняў.

Дэфіцыт. Польскія чыгункі за першую чэцьверць с. году далі 4 мільёны зл. дэфіцыту.

Грошы. У Польшчы ў абегу грошай білёнам ёсьць 344 мільёны зл.

Хоча адкапаць 12 мільёнаў залатых рублёў. Адзін Беларус—Александраў зьвязіўся ў японскі консулят у Харбіне і папрасіў дазволу адкапаць у порце Артур 12 мільёнаў залатых рублёў, якія закапала там адна расейская вайсковая часьць падчас японска-расейскай вайны. Александраў памагаў закопываць. Японскі ўрад быццам на гэта дазвол даў.

Вось ідзе селянін Саўка, — паўзіраешся, які здаравенны мужычышча, а з якой пакорай схіляецца ён, нягнушчы, быццам дуб той у час непагоды.

Дагадваецца Лісоўскі, чаго так схіляецца прад ім Саўка, падходзіць канец вэксэлю, а грошай, пэўне, нямашака...

— Нічога, пачакаемо — думае ён — абы працэнты ў час свой выплачваў.

Ідзе далей, мармочучы сабе пад нос нейкую песьню, гаспадарскім вокам пазірае па сяле — ці няма дзе непарадку.

Па дарозе накрычаў на дзяцей, каб ня швэндаліся без работы, зачапіў маладзіцу, выйшаўшую па ваду да калодзежа.

Дайшоў да Антонавай сядзібы. Бачыць, на калодках, перад хатаю, сядзяць мужчыны, гутараць, сьмяюцца. Між імі— Антон з кніжкаю.

„Ага, кніжку маю чытаюць! — падумаў Лісоўскі. — Ну, няхай сабе чытаюць! Спыніўшыся проці грамады, ён спытаў:

— Ну, што? Як кніжачка — спадабалася?

— А, нічога сабе! — адказвае Антон,— вясёлая кніжка.

— Ну, чытайце, чытайце! — гукае Лісоўскі й йдзе далей.

„Вясёленькая кніжачка!...ха-ха-ха!...усьмяхаецца ён, — ім што ні малоць языкам, абы малоць. А яшчэ й рагочуць!... І што яны там знайшлі цікавага?

Яго пачало цягнуць паўслухацца, аб чым у іх ідзе гутарка, чаго яны сьмяюцца. Зышоўшы з дарогі, ён няпрыкметна падыйшоў пад Лявонаў садочак і пачаў з-за паркану прыслухоўвацца.

Услухаецца — чуе, Антон чытае па складох: «Крестьянин обязался перевезті із города 50 ламп с тем условіем, чтобы за каждую доставленную в целости лампу платили ему по 5 кап., а за каждую разбитую высчитывали с него по 1 р. 20 к. При перевозке 3 лампы разбились. Сколько заработал крестьянин за доставку ламп?

Антон, дачытаўшы задачу да канца, падняў чырвоны ад натугі твар і вясёлымі вачыма азірнуў слухачоў.

— Пытаецца: скольні-ж ён зарабіў? — сьмяючыся перакazвае сваімі славамі Антон.

— Пэўне добра зарабіў! — сказаў барадаты дзед у белых нагавіцах і, выняйшы з зубоў люльку, зарагатаў.

— Не скажу ўжо, скольні ён там зарабіў, але-ж толькі ведаю, што як пачне гэтак зарабляць, дык хутка й апошняга коніка Сролю збудзе,—дадаў рудзенькі і жвавы Язэп.— Няхай іх чорт возьме і з заробкамі такімі!

— Ці ня таксама назарабляў і Захараў парабак у маёнтку, — пачаў апавядаць дзед у белых нагавіцах. Прабыў ён, ведаеце, тыдзень пры малатарні ў пана, прыходзіць у суботу ўвечары да хаты. — „Ну, кажа, бацька, давай, сынку, грошы: заўтра трэба йсьці ў места купіць солі, сярнічак і тагосяго. А ён стаў дый кажа: вось хоць біце мяне, хоць лайце, а грошай ані шэлега ня прынёс! — А бацька: „дзе-ж ты, сабачы сын, падзеў іх? Цалюткую нядзелю хадзіць-хадзіў, а прынёс — хвігу?... Што, можа згубіў, ці ўкралі?» — Не такая была-б шкода, каб я іх згубіў, ці ўкралі, а то зусім і ў руках ня трымаў!...

Потым і расказывае, што зламалася штосьць у веялцы, а віну склалі на яго. Прыказчык аблаяў яго і пры разрахунку ня даў ні капейкі, дый прыказаў прыходзіць адрабляць за страту яшчэ тыдзень. Бацька слухаўслухаў, дый кажа:„вось так, сынку, заўсягды зарабляй, хутка й багатым станеш і гаспадаром добрым будзеш“... (д. б.)

Беларускую кніжку і газэту найтаней дастанеце
ў Беларускай кнігарні «ПАГОНЯ.»
Вільня, Завальная вуліца № 1—1.

Да нас пішуць.

ПАНСКАЯ ЛАСКА.

Шаркаўшчына, Дзісьненскага пав. Нядоля і цяжкае жыцьцё пхае селяніна бядака і да панскай ласкі, каб пазычыць чарапок жыта, кошык бульбы, рэзьгіні сена або куль саломы... Смак гэтай кожны беларускі селянін ведае, бо жыве ў гэткім горы праз усё сваё гаротнае жыцьцё. Вось было гэта і ў в. Бар., з якой селянін пазычыў у пана два вазы аўсянай саломы, каб пракарміць жывёліну да травы. За гэтую ласку селянін з жонкай - сам з касой, а жонка з сярпом у руках—мусілі працаваць пану аж праз 7 дзён за процант, бо салому трэба аддаць. Дык вось якая панская ласка!

С. Гаротны.

ТУТ НЯ ДОБРА І ТАМ НЯ ЛЕПШ.

Леанполь, Браслаўскага пав. Калі гэта мы беларусы ды ня будзем „русской вѣры"? У нас, як ва ўсей Беларусі—рускій сьвяшчэньнік, а праваслаўе называецца „рускoй верай." Сьвяшчэньнікі за трэбы дзяруць колькі дасца. З прычыны гэтай праваслаўныя ідуць да ксяндзоў і прыбываюць да „польскай веры" гэтак у нас называюць каталіцтва. Паглядзеўшы, дык і там—у „польскай веры"—ня лепш, як у „веры рускай." Тут сьвяшчэньнікі маскалі, а там ксяндзы палякі. А мы веруючыя людзі, як адны так і другія, беларусы. Сапраўды гэта іронія лёсу. Трэба шукаць праўды і выхаду, а то наш народ саб'юць з глуздоў.

Д.

НЯЎЖО І ПАЖАРНАЯ СТРАЖА НАЦЫЯНАЛЬНА-ПОЛЬСКАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ?

Беліца, Лідзкага пав. Ніколі мне ня прыходзіла ў галаву, што і Пажарная стража ў нашым краю мае місію польскага нацыялізму. Я ўважаў, што гэта арганізацыя аднолькава для ўсіх нацыянальнасьцяў і мае на мэце толькі тушыць пажары, а не разьвіцьцё польскай культуры. Тымчасам я ў сваіх думках мыляўся. А пацьвярджае аб гэтым ніжэй паданы дакумант.

Związek Okręgowy
Straży Pożarnych
pow. Lidzkiego
Nr A. I

Lida 3.VIII-33 r.
Okolnik Nr 3.

Do
Zarządu Ochotniczej Straży Pożarnej
w. . . . . . .

W związku ze stale napływającemi podaniami o udzielenie zezwolenia przez Starostwo na urządzenie przedstawień w języku żydowskim lub innym wyjaśniam, że Ochotnicza Straż Pożarna jest organizacją społeczną nawskroś polską i z tego też tytułu obowiązuje używanie tylko języka polskiego. Używanie innych języków czy to podczas ćwiczeń, posiedzeń i t. p., jak również urzędzanie przedstawień jest niedopuszczalne. Zarządy Straży, które nie zastosują się do powyższego, będą pociągani do odpowiedzialności korporacyjnej lub rozwiązywane...

Подпіс: Pasek Instruktor Pożarnictwa.

Цікава, ці гэты „окульнік" абавязвае Пажарную Стражу толькі ў Лідзкім павеце ці і ва ўсім нашым краю. Сапраўды, выглядае, што Пажарная Стража ў Лідзкім павеце існуе больш дзеля тушэньня няпольскай культуры, чымсь пажараў, бо хто не падпарадкуецца гэтаму „окульніку" дык будзе „розвёнзаны" і пажары няхай сабе гараць.

Супроць гэтага распараджэньня трэба зьвярнуцца ў Дырэкцыю ўбясьпячэньня ад агню, тлумачачы, што яно супярэчнае з абавязуючымі у нашым краю законамі і супярэчнае з характарам самой арганізацыі, у якую ідуць і беларусы і літоўцы, жыды і палякі, каб супольна бараніць сваей і грамадзкай маемасьці ад пажараў.

Гэткае распараджэньне бязумоўна абражае нацыянальнае пачуцьцё сяброў гэтай арганізацыі не палякоў, якія становяць большасьць і гэтым спыняе шырэйшую арганізацыю Пажарнай Стражы. Але шовіністы асьлепленыя нацыяналізмам гэтага ня бачаць. Яны ўсё кладуць у ахвяру нацыяналізму.

Пажарнік.

Б. Б. і Т. Б. А.

Ініцыялы „Б. Б." абазначаюць „Беспартыйны Блёк Супрацоўніцтва з Урадам." Гэта афіцыяльна-моцная цяпер польская партыя мае вялікія ўплывы на нутраную і загранічную палітыку ў Польшчы. Бяссумніўна гэта партыя праводзіць сваю праграму і ў палітыцы адносна беларускага народу. А праграма гэтай партыі адносна Беларусаў відаць з тэзаў, якія абавязваюць кожнага партыйца „Б.Б." і тыя арганізацыі, што з Б.Б. супрацоўнічаюць.

„ТЭЗЫ ПОЛЬСКА-БЕЛАРУСКАЙ ГРУПЫ Б. Б.

1 Навязаньне сужыцьця між польскім і беларускім грамадзянствам.

а) дакладнае пазнаньне беларускай культуры,
б) супольнае супрацоўніцтва ў грамадзкіх, гаспадарчых і самаўрадавых арганізацыях,
в) таварыскае сужыцьцё,
г) зьвяртаньне ўвагі ўрадавых чыноўнікаў на спэцыяльныя варункі тэрыторыі Паўночна-Усходніх Зямель,
д) падняцьце аўторытэту Дзяржавы і дзяржаўнай улады пры помачы падбору на нашай тэрыторыі дабранага чынавецтва (вучыцялёў, адміністрацыйных чыноўнікаў і г.д.).

2. Падняцьце духовай культуры і асьветы сярод беларусаў шляхам:

а) забесьпячэньня выхаваньня маладой беларускай інтэлігенцыі праз пашырэньне надзору над сярэднім школьніцтвам і апекі над вучнёўскай моладзяй,
б) стварэньне і пашырэньне беларускай прэсы і выдавецтва, друкаваных лацінкай.

3. Палепшаньне матэрыяльнага стану і дабрабыту народу беларускага праз:

а) уцягваньня шырокіх мас у існуючыя арганізацыі і тварэньне супольна з палякамі новых арганізацыяў гаспадарчых: супалак, коопэратываў, касаў і г. д.
б) падняцьце гаспадарчага і культурнага стану гарадоў і мястэчак як асяродзьдзяў, у каторых будзе адплываць прырост насельніцтва ў вёсцы і дзе будзе жыць, вучыцца і разьвівацца беларуская інтэлігенцыя,
в) датасаваньне і рэалізаваньне спэцыяльнай гаспадарчай праграмы дзеля асягненьня гаспадарчага роўня Паўночна-Усходніх земель з цэласьцяй Дзяржавы."

Вось чым хоча ашчасьлівіць беларусаў Б.Б., якому памагае рэалізаваць гэту „скромную" нічога беларусам карысная ня суляючую праграму і Т. Б. А. ці выразней — „Таварыства Беларускай Асьветы."

З краю.

Унійная конфэрэнцыя. У пачатку г. м. адбылася чацьвертая чарговая унійная конфэрэнцыя ў Пінску. На гэтай конфэрэнцыі былі польскія біскупы лацінікі, біскупы ўсходняга абраду, польскія ксяндзы, уніяцкія сьвяшчэньнікі і, як падаюць газэты, некалькі сьвяшчэньнікаў праваслаўных.

Пастух прастрэліў пастуха. У в. Гарадзілавы Бор, Вялейскага пав. пастух Юры Сыраквас забаўляючыся абразанкай выстрэліў і прастрэліў пастуха Вінцука Зялёнку. Раненага Зялёнку адвезьлі ў шпіталь у Вялейку.

Пажары. У Вялейскім павеце ў ночы з 11 на 12 г. м. у двары Шыпкі згарэў дом на 10.000 зл. Прычына пажару: нядобра збудаваны комін. У Віленска-Троцкім павеце ў засьц. Паўлоўскія Пасекі згарэў дом і хлеў на 2.000 зл. Прычына пажару: нядобры комін.

УСЯЧЫНА.

„Паступовасьць" у сэрбскай праваслаўнай царкве. Апошнімі часамі праводзіцца акцыя сярод праваслаўнага духавенства ў Сэрбіі, каб можна было сьвяшчэньнікам другі раз жаніцца. За ўвядзеньне гэтага закону ў царкву стаяць многія праваслаўныя епіскапы.

„Лютэр II". На пратэстанскім зьездзе ў Эйслебэн у радзімай мясьціне Марціна Лютра ў 450 ўгодкі яго нараджэньня, лютэранскі „біскуп" Мюльлер у прамове сказаў, што ў постаці Адольфа Гітлера ўваскрос Лютэр.

З ВІЛЬНІ.

Братаньне Стральцоў.

У суботу і ў нядзелю 9 і 10 г. м. адбыўся зьезд польскіх Стральцоў з усяе Польшчы. Некаторыя польскія газэты гэты зьезд Стральцоў называюць „Дзень братаньня". І сапраўды гэта выглядала на „братаньне", бо па вуліцах машыравала з стрэльбамі нясьведамая беларуская моладзь, такая-ж моладзь літоўская і прыбыўшыя стральцы з Польшчы. Але вось дзіва, што польскія газэты спасьцераглі „разбратаньне", якое ўважаюць за патрэбу „збратаньня".

Малое непаразуменьне полёнофілаў.

Прыбыў у Вільню (кажуць на падмогу А. Луцкевічу і Кумпаніі — прып. друк.) драматург Аляхновіч і зайшоў у Т.Б.А. прадставіцца і пазнаёміцца з сябрамі. На гэтае спатканьне беларускія ўгадоўцы папрасілі ў пам. Т.Б.А. усіх быўшых і цяперашніх полёнофілаў. Прыбылі хто толькі жывы. Прышоў запрошаны і дзядзька Тодар Вярнікоўскі. Гэты сход выглядаў на кангрэс нябошчыкаў з жывымі. У жывых полёнофілаў — беларускіх угадоўцаў падняўся дух і праляцела думка шырокага полёнофільскага абяднаньня. Пачалося ад дзядзькі Тодара Вярнікоўскага. Справа выглядае гэтак:

Antoni Łuckiewicz убачыўшы на залі пам. Т.Б.А. дзядзьку Тодара Вярнікоўскага, з залі шмыгнуў у каморку, кіўнуў на Астроўскага, Самойлу ды Трэпку і пачалася нарада. Папрасілі ў каморку і дзядзьку Т. Вярнікоўскага ды тыц яму прапазыцыю: аддай у Т.Б.А гурткі „Прасьветы". Дзядзька Тодар на дыбы і бух на стол „міністэрскія" паперы. Пачалася „дыплёмацыя". Аднак дзядзька Тодар не паддаўся — гурткоў „Прасьветы" ня ўступіў. Паўстаў інцыдэнт, які з каморкі выкаціўся і на залю, дзе дзядзка Тодар зьвярнуўся да прысутных з славамі: — мы дзеці аднаго „таты" і калаціцца нам няма чаго, а яны цюцікі трэбуючы ад мяне таго, чаго я ня маю, заводзяць тут калатню, дык ведайце, што аб гэтым „тата" будзе ведаць. І сапраўды, дзядзька Тодар пашоў да „таты" і ўсё расказаў, ды ўжо запозна, бо пакуль ён старычок даваломся, малодшыя сыны полёнофіліі „тату" ўсё расказалі пасвоему. „Тата" аднак, выслухаўшы жалабу старычка Дзядзькі Тодара, абяцаў справу разгледзіць ды пасвараных сыноў пагадзіць.

Паны баяцца, а слугі дрыжаць.

Яшчэ ня было і ўзароду „Беларускай Газэты", якую цяпер выдае ў Вільні нейкі А. Карповіч, а былі беларускія арганізацыі, якія ў аб'яднаньні становяць Беларускі Нацыянальны Камітэт і выходзіла „Беларуская Крыніца". Працярпелі гэтыя беларускія арганізацыі, а так-жа і „Бел. Крыніца" нямала напасьцяў з боку маскоўскіх камуністаў і з боку польскіх шовіністаў. А за што? Адказ просты і ясны: — за незалежніцкую ідэолёгію Беларускага народу.

Праходзілі часы і мяняліся людзі. „Радыкалы" рожнага колеру ліцытаваліся прад беларускім народам „радыкалізмам" і маляваліся то на чырвоных, то на белых: адны выяжджалі па заслужанае ў Саветы, а другія тварылі санацыйныя пляцоўкі і заводзілі беларуска-польскую ўгоду. Незалежніцкія арганізацыі аб'еднаны ў Беларускім Нацыянальны Камітэт трымаліся аднае лініі і цьвердзяць адно, што Беларускі народ мае ўсе правы да жыцьця і гэтага права ня ўступяць ані расейскім камуністам, ані польскім шовіністам. Пры гэтым Беларускі Нацыянальны Камітэт выступаючы з дамаганьнямі ажыцяўленьня гэтых правоў Беларускаму народу ня гладзіць па галаве расейскага камунізму і не патурае польскаму шовінізму. Не падабаецца гэта адным, ня любяць гэтага і другія

Праходзілі часы і зьмяняліся міждзяржаўныя адносіны. Пасварыліся маскоўскія камуністы з нямецкімі гітлероўцамі. Палякі пачалі братацца з бальшавікамі. Нямецкі гітлеровец Розэмбэрг узяў ды сказаў недзе, шсо трэба ў Эўропе стварыць Літоўска-Беларуска-Украінскую фэдэрацыйную дзяржаву. Ці гэта сапраўды гітлероўцы думаюць рабіць, ці проста Розэмбэрг сказаў, каб пастрашыць баязьліцых, ня ведама. Аднак баязьлівым страху нагнаў. Тады як з пад зямлі вырас у Вільні нейкі А. Карповіч і пачаў выдаваць газэту пад назовам „Беларуская Газэта".

Выходзіць нумар за нумарам і ўсё проціў Беларускага Нацыянальнага Камітэту і „Беларускай Крыніцы" ды ўсё проціў незалежніцкіх ідэалаў Беларускага народу. Проціў маскоўскага камунізму і польскага шовінізму ані слова, а ўсё толькі на Беларускі Нацыянальны Камітэт, „Бел. Крыніцу" і павадыроў беларускага незалежніцкага руху ўж-га ды ўж-га паказваючы ў бок дэфэнзывы і чырвонай Масквы: глядзіце а вун яны „хадэкі" здаўных дамагаюцца незалежнасьці Беларусі, а цяпер аб гэтай ужо незалежнасьці загаварыў і гітлеровец Розэмбэрг. Вот дык перапалох!!!

Словам, паны спужаліся, а слугі у „Беларускай Газэце" дрыжаць.

П—К.

Немец купляе календар нямецкі, паляк — польскі, а беларус павінен купляць толькі
КАЛЕНДАР БЕЛАРУСКІ!

Рэдактар Ян Пазьняк. Бел. Друк. ім. Фр. Скарыны, Вільня. Выдавец А. Шутовіч.